Просто хорошая газета

Отдушина

12+

№9 (808) 26 февраля 2020 года

Выходит один раз в неделю | Основана 18 октября 2002 года | Издатель УП «Газета Слонимская» | ГАЗЕТА РЕКЛАМНАЯ ДЛЯ ДОСУГА

Слонімскі атлет выступіць ад Беларусі ў Партугаліі

Слонімец Аляксей Нічыпар трапіў у склад зборнай Беларусі па лёгкай атлетыцы і выступіць ад краіны на Кубку Еўропы па доўгіх кіданнях у Партугаліі. Інфармацыяй пра гэта падзяліліся ў СДЮШАР №3 горада Слоніма, выхаванцам якой атлет з`яўляецца.

Спаборніцтвы пройдуць 21-22 сакавіка ў горадзе Лейрыя. У склад зборнай спартовец патрапіў па выніках адбору і паспяховых выступаў у рэспубліканскіх і міжнародных спаборніцтвах.

Аляксей Нічыпар выступае ў штурханні ядра і кіданні дыска.

Максім СУДЗІЛОЎСКІ



Аляксей Нічыпар

ШАШКІ

У ШАШКАХ ПЕРАМАГЛІ СЛОНІМЦЫ


Лепшыя шашысты і іх трэнеры

У Мінску з 15 да 21 лютага праходзіла першынство Беларусі па шашках-64. У ім удзельнічалі некалькі слонімскіх дзяцей.

У турніры прынялі ўдзел 150 спартоўцаў з усіх рэгіёнаў краіны ў пяці ўзроставых катэгорыях сярод юнакоў і дзяўчат.

У класічных шашках пераможцам стаў Марат Леў са Слонімскага раёна. Бронзавы медаль дастаўся Іллі Астаф`еву. Абодва выступалі ва ўзроставай групе юнакі 2004-2006 гадоў нараджэння.

У бліц-праграме шашысты Гродзенскай вобласці заваявалі тры залатыя і два сярэбраныя медалі. На вышэйшую прыступку ў гэтай шашачнай гульні падняўся Марат Леў, а Ілля Астаф`еў стаў другім.

Спартсменаў падрыхтаваў Аляксандр Аніська.

Максім СУДЗІЛОЎСКІ

СПОРТ

ПАДЗЕННЕ НА ФОНЕ ПОСПЕХУ

Слонімскі раён заняў трэцяе месца па спартыўных выніках у абласным аглядзе-конкурсе за 2019 год. Пра гэта паведамілі 21 лютага на выніковым (пашыраным) пасяджэнні калегіі ўпраўлення спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама ў Гродне.


Падчас урачыстай часткі за значны ўнёсак у развіццё фізічнай культуры і спорту ўзнагароджылі начальніка аддзела спорту і турызму Слонімскага раённага выканаўчага камітэта Валерыя Сідорчыка. Яму ўручылі граматы Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь. Ад Слонімскага райвыканкама на сходзе таксама прысутнічала намеснік старшыні Слонімскага райвыканкама Тэрэса Юшкевіч.

Але трэці вынік не лепшы вынік, які можа паказваць Слонімскі раён у спорце. На сайце slonimsport.by ёсць інфармацыя, дзе гаворыцца, што па выніковасці самым паспяховым годам быў 2016 год. У той год мы апярэдзілі па дасягненнях нават Лідскі і Мастоўскі раёны і былі на першым месцы. Годам пазней развіццё спорту ў Слонімскім раёне стала на пазіцыю горш. Інфармацыя за 2018 год адсутнічае.

Максім СУДЗІЛОЎСКІ

ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА

НАЦЭЛЕНЫЯ НА МЕДАЛІ


Уладзіслаў Чэмармазовіч

У Магілёве 21 і 22 лютага праходзіў адкрыты чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па лёгкай атлетыцы ў памяшканні. Лепшыя прадстаўнікі краіны, пераможцы і прызёры папярэдніх спаборніцтваў, аспрэчвалі ўзнагароды чэмпіянату. Сярод іх былі выхаванцы СДЮШАР №3 горада Слоніма.

Пераможцам чэмпіянату ў скачках з шастом у мужчын стаў Уладзіслаў Чэмармазовіч, які паказаў вынік 5,10 метра.

Тры слонімскія атлеты прывезлі дамоў сярэбраныя медалі — Аляксей Нічыпар у штурханні ядра (19,23 м), Дар`я Палуэктава ў спартыўнай хадзе на 5000 м (21 хвіліна 05.83 секунды), Юлія Кароль у бегу на 800 м (2 хвіліны 04.84 секунды).


Бронзавым прызёрам чэмпіянату на дыстанцыі 10 000 м стала Дар`я Палуэктава (45 хвіліны 39.55 секунды) — яе асабісты рэкорд.

Каманда Гродзенскай вобласці заняла трэцяе месца, пусціўшы наперад лёгкаатлетаў з Магілёўскай і Брэсцкай абласцей.

Максім СУДЗІЛОЎСКІ

Пазнай сябе на фота

Паважаныя чытачы! Пазнавайце на старых фотаздымках сябе, сваіх знаёмых і блізкіх і тэлефануйце нам: 8 (01562) 29-999, 8 (029) 133-04-21 у працоўныя дні з 9:30 да 17:30. Найбольш цікавыя распаведы пра герояў здымкаў будуць надрукаваны ў газеце, а іх аўтары атрымаюць запрашальныя квіткі на спектаклі Слонімскага драматычнага тэатра.



Фатограф



Дарожнікі

На фотаздымак дарожнікаў, надрукаваны ў мінулым нумары «Аддушыны», адгукнулася наша даўняя чытачка Таццяна Захаранка.

— Справа на здымку стаіць Валодзя Ракевіч. Гэта паблізу апошняга аўтобуснага прыпынку на Баранавіцкай вуліцы ў Альбярціне. Валодзя там жыве. Другога мужчыну на здымку я не ведаю, — расказала Таццяна.

Нашы чытачы Андрэй Астапенка, Уладзімір Скок, Уладзімір Крынчык, Ігар Іўчанка і Таццяна Захаранка атрымаюць запрашальныя квіткі на спектакль Слонімскага драмтэатра «Тустэп на фоне чамаданаў», які пакажуць у нядзелю, 1 сакавіка. Пачатак у 17.00.

Мікола КАНАНОВІЧ

ФОТА З АРХІВА «ГС»

СЛОНИМСКИЙ «ФОРСАЖ» ПОБЕДИЛ, НЕ ИГРАЯ

В воскресенье, 23 февраля, из-за неявки соперника слонимскому «Форсажу» была присуждена победа.



ФОТО ИЗ АРХИВА «ГС»

Момент игры

МФК «Ошмяны», потерпев поражение от «Форсажа» в домашнем матче со счётом 5:8, не прибыл на ответную встречу 1/4 финала чемпионата Гродненской области по мини-футболу в Слоним. За неявку на игру им присуждено техническое поражение — 0:5.

Слонимская команда продолжит соревнования и в полуфинале встретится с зельвенской «Энергией».

Сергей БУЗУН

ФУТБОЛ



ФК «Слоним 2017» в Лиде сыграл вничью

В пятницу, 21 февраля, в товарищеском матче ФК «Слоним 2017» разошёлся безголевым миром с ФК «Лида».

Каждой игре предшествует работа на тренировках, отработка игровых моментов. Идёт предсезонная подготовка, отбор потенциальных кандидатов в команду. Проходит процесс притирки и нахождения взаимопонимания в коллективе. Много игроков находится на просмотре. Степень их готовности проверяется в игровых спаррингах. Хотя не последнюю роль в товарищеских встречах играет и результат.

ФК «Лида» — ФК «Слоним 2017» — 0:0

Слоним 2017 (1 тайм): ИНП, Лозко, Чудук (к), ИНП, Силинский, ИНП, Орлов, ИНП, Влад. Берг, ИНП, ИНП.

Слоним 2017 (2-й тайм): Шишлов, Спасюк, Баль, Влад. Берг, ИНП, Козлов, Чудук (к), Силинский, ИНП, Курышев, Лозко.

Игра проходила в интересной борьбе. Каждый из соперников хотел отличиться и победить.

Были и опасные моменты у обоих ворот. Но всё-таки матч завершился безголевой ничьей.

29 февраля на стадионе Слонимского УМГ состоится очередной спарринг с ФК «Ивацевичи».

Сергей БУЗУН
ФОТО АВТОРА

ШАХМАТЫ

В СЛОНИМЕ НАЧАЛСЯ ДЕТСКИЙ ТУРНИР ПО ШАХМАТАМ



В субботу, 22 февраля, в СШ №2 Слонима начался детский шахматный турнир, посвящённый Дню защитника Отечества и Международному женскому дню 8 Марта.

В турнире принимают участие дети всех возрастов и разного уровня шахматной подготовки.

Первый день соревнования без потери очков завершил Роман Горбацевич.

Главный судья турнира — Валерий Медведь.

Сергей БУЗУН
ФОТО АВТОРА

«Надежда» чествовала защитников Отечества



Мужчины клуба «Надежда»

20 февраля в Слониме прошло заседание клуба «Надежда», посвящённое Дню защитника Отечества.

В этот день чествовали сильных, храбрых и отважных членов клуба.


Для всех присутствующих был подготовлен праздничный концерт с участием хора ветеранов «Память», военнослужащих Вячеслава Дубровина и Дмитрия Красевского, а также учащихся Гродненского государственного колледжа искусств.

Мария КОНДАКОВА
ФОТО АВТОРА


Хор ветеранов «Память»

ШЕСТЕРО ЩЕНКОВ ИЩУТ ДОМ

Уже три дня эти шестеро малышей живут в лесу около Тивинщины. Кто-то привёз и выбросил их как мусор.


Брошенные щенки

Щенков нашли неравнодушные люди. Малышей подкармливают, но всё же им нужен дом, постоянный ДОМ с надёжными и добрыми хозяевами!

Щенкам на вид месяца четыре, не более, они не будут большими. По всем вопросам обращаться по телефонам +375336204004 Оля или +375259487691 Елена.

Ольга КРУПОДЁРОВА

«Крок» — это стильная обувь, удобная каждому



С первых слов владельца магазина «КРОК» Андрея Глушени понимаешь, что человек искренне влюблен в свое дело, в которое вложены и душа, и сердце, и здоровый расчет. Профессионально обувью Андрей занимается с 2010 года.

В небольшом торговом зале магазина «КРОК» можно найти обувь, которая отвечает требованиям сдержанного английского стиля, и обувь, в которой можно смело покорять городские джунгли, и обувь, которая украсит любую пару женских ножек!

Поэтому магазину крайне необходим менеджер по продажам!

50% всей обуви — это продукция тульской фабрики «ТОФА». Все модели, которые выпускает фабрика, разработаны технологами и модельерами из Тулы.

Для изготовления обуви используются материалы из Турции. Цветовая гамма представленных моделей очень разнообразна.

В проекте — плотное сотрудничество с Ростовом-на-Дону. В настоящее время решается вопрос по маркировке.



Согласитесь, в такой обуви можно наслаждаться каждым шагом и чувствовать невесомость на земле!

Фейерверк эмоций вызывает коллекция обуви крупнейшей международной мультибрендовой компании с 25-летней историей ANALPA, одного из лидеров сегмента FASHION CASUAL. Ежегодно ANALPA участвует в десятках международных выставок и открывает новые офисы в разных странах мира. В числе всемирно известных брендов компании — COVANI, KEDDO, BETSY, ELISABETH.

И они на прилавках слонимского магазина «КРОК»!

Это обувь и аксессуары, различные по целевой аудитории и целевому сегменту. Обусловлено это тем, что коллекцию марок ANALPA создает интернациональный штат дизайнеров, среди которых как гуру мирового дизайна, так и молодые модельеры.

Миссия корпорации ANALPA — сделать высокую моду доступной для людей с любым достатком!



Глядя на эти шикарные товары, так и хочешь воскликнуть: «Инвестируйте в классику!»

В подтверждение этих слов посетительница покупает далеко не первую пару обуви в магазине.

Слова девушки радуют продавца: «Обязательно приду за следующей парой!»

Еще одна покупательница продолжает: «Я впервые познакомилась с обувью «ТОФА» непосредственно в самой Туле, посетив фирменный магазин. Приобрела там пару осенних натуральных замшевых ботиночек. Это было несколько лет тому назад. Но ботинки живы и любимы мною до сих пор! Более того, я была удивлена, обнаружив рекламный щит с указателем «ТОФА» два года назад в Слониме. Безусловно, зашла. И ушла оттуда с покупкой вновь! Пара удобнейших демисезонных ботинок из натуральной кожи на гибкой подошве как нельзя кстати подошла к моему новому синему пальто!»

В магазине «КРОК» мужчины также могут приобрести различную обувь. В частности, мужская стильная обувь CROSBY сочетает в себе функциональность, износостойкость и практичность. Поэтому в ней так комфортно заниматься фитнесом, путешествовать и просто передвигаться по городу.



И ведь логично: чтобы унести все из магазина «КРОК», женщинам понадобится мужская сила.

Милые женщины, так возьмите с собой мужчину, на которого можно опереться, примеряя пятнадцатую пару обуви!

Владелец магазина Андрей приглашает и мам с детками. Ведь ликвидация коллекции детской обуви происходит с 50%-й скидкой!

К слову, и мы, сотрудники редакции «Газеты Слонимской», не покинули магазин «КРОК» без покупок. Не смогли уйти от приятного соблазна.



В нынешних погодных условиях не обойтись и без средств ухода за обувью. Ассортимент их рассчитан на любой кошелек.

Такой же магазин открыт и в Зельве, где давно нашел своих благодарных покупателей.

Почему обувь настолько удобна, Андрей рассказывает:

— В лабораториях компаний исследуются новейшие технологии, разрабатываются и конструируются уникальные колодки и подошвы, создаются материалы и тестируются их эксплуатационные характеристики.

Покидали мы магазин «КРОК» с чудесным настроением. Андрей на прощание произнес мудрую фразу, обращаясь к слонимчанам и гостям нашего города.

— Приходите к нам примерить обувь!

А для меня и моих коллег стало очевидным, что магазин «КРОК» — это идеальный выбор тех, кто хочет быть в тренде, не сливаясь с толпой!

Более подробно коллекцию обуви и аксессуаров, представленных в магазине «КРОК», вы можете посмотреть на сайте нашей «Газеты Слонимской»:

www.gs.by;
ok.ru/profile/592419666781;
instagram.com/krok1976/

Время работы

вторник — пятница: с 10:00 до 18:00;
суббота — восресенье: с 10:00 до 15:00;
понедельник — выходной.

Адрес: г. Слоним, ул. Советская, д. 5.

УНН 590167810
На правах рекламы
Жанна БУЛАВЧИК

СЛОНІМЦЫ ЗМАГАЛІСЯ ДА ПЕРАМОГІ

У Салігорску завяршыўся міжнародны турнір, прысвечаны Дню абаронцы Айчыны і памяці ветэранаў салігорскага боксу.



ФОТА З АРХІВА АЎТАРА

Перад боем

Турнір праходзіў з 21 да 23 лютага і прымаў спартсменаў з Беларусі, Украіны, Літвы, Азербайджана і Расіі. У складзе беларускай каманды спаборнічалі слонімцы.

У вагавай катэгорыі 80+ вызначыўся наш зямляк Павел Панкрацэнка, які стаў залатым медалістам турніру.

Бронзавыя медалі заваявалі Максім Карповіч (42 кг), Міраслаў Рагозін (42 кг), Арцём Бальшоў (50 кг).

Хлопцаў рыхтавалі да міжнароднага турніру Іосіф Міцкевіч і Турал Хангуліеў.

Максім СУДЗІЛОЎСКІ

БЕЗЛИМИТНЫЙ АБОНЕМЕНТ НА ОДИН МЕСЯЦ ОТ ФИТНЕС-ЦЕНТРА «ГАРМОНИЯ» НАШЕЛ СВОЕГО ОБЛАДАТЕЛЯ

Стало известно имя победителя фотоконкурса «Настоящий мужчина». Им стал Захар Борушко.

За его фотографию посетители сайта gs.by отдали 188 голосов.
Поздравляем Захара с победой и ждем на награждение в фитнес-центре «Гармония» 28 февраля в 13.00.



Захар Борушко

«Мама, мама, ты со мной как за каменной стеной!
Свою маму и сестру я в обиду не даю,
Потому что, как и папа, очень-очень их люблю!
Всем мужчинам я желаю быть сильнее с каждым днём,
Чтобы, женщин защищая, согревали их теплом!

ЗДОРОВЬЕ

Мед и корица излечат от всех болезней?



Кажется невероятным, но это действительно так. Сайт Prokrasotu уверяет, что мед, смешанный с корицей — практически панацея какая-то. Они помогут хоть при простуде, хоть при язве, хоть при потере слуха. Главное — правильные пропорции и частота приема. Проверим!

Вот от каких проблем должны помочь два «волшебных» ингредиента.

Болезни сердца

Ежедневно ешьте на завтрак хлеб, намазанный вместо джема пастой из меда и пудры корицы. Это снижает уровень холестерина в артериях и спасает человека от инфаркта. Даже те, у которых уже был инфаркт, могут уменьшить риск повторного инфаркта. Регулярное употребление меда с корицей улучшает дыхание и укрепляет мышцу сердца. В некоторых домах престарелых Америки и Канады регулярный прием смеси меда и корицы пациентам заметно улучшил состояния их, подвергшихся возрастным изменениям, вен и артерий.

Слабость

Недавние исследования показали, что содержание сахара в меде скорее полезно, чем вредно для поддержания сил. У пожилых людей, принимающих мед и корицу в равных пропорциях, улучшается концентрация внимания и подвижность. Доктор Милтон, который проводил исследования, говорит, что ежедневный прием пол столовой ложки меда с добавлением корицы в стакане воды, с утра натощак и после полудня, примерно в 15:00, когда жизненные функции организма начинают снижаться, повышает жизненные функции в течение нескольких дней.

Артрит

Страдающие артритом могут ежедневно, утром и вечером, принимать 1 чашку теплой воды с 2 л. меда и 1 маленькой ч.л. корицы. Регулярный прием вылечивает даже хронический артрит. В недавних исследованиях, руководимых Копенгагенским университетом, установлено, что когда доктора назначали своим пациентам смесь 1 ст.л. меда и 1/2 ч.л. корицы перед завтраком, через неделю у 73 пациентов из 200 полностью прошла боль, а в течение месяца большинство пациентов, которые не могли ходить или передвигаться из-за артрита, смогли ходить, не ощущая боли.

Повышенный холестерин

2 ст. ложки меда и 3 ч.л. корицы, смешанные с 2 стаканами теплой воды, уменьшают уровень холестерина в крови на 10% в течение двух часов. Как и для страдающих артритом, прием смеси 3 раза в день приводит в норму холестерин даже у хронических больных. Люди, ежедневно принимающие с пищей мед в чистом виде, также меньше жалуются на холестерин.

Пониженный иммунитет

Ежедневный прием меда и корицы укрепляет защитные функции организма и защищает от бактерий и вирусов. Ученые обнаружили, что мед содержит множество различных витаминов и железо. Постоянный прием меда усиливает способность белых кровяных шариков сражаться с бактериальными и вирусными заболеваниями.

Воспаление мочевого пузыря

Принимать 2 ст. л. корицы и 1 ч. л. меда, размешанные в стакане слегка теплой воды. Это убивает микробов в мочевом пузыре.

Выпадение волос

При выпадении волос или облысении можно смазывать корни волос пастой из смеси разогретого оливкового масла, 1 ст. л. меда, 1 ч. л. корицы перед мытьем головы на 15 мин. Затем промыть волосы слегка теплой водой. Даже 5 мин. достаточно, чтобы был заметен эффект.

Кожные инфекции

Смесь меда и корицы (в равных количествах), нанесенная на пораженные части кожи, излечивает экзему, грибок и все другие виды кожных инфекций.

Прыщи

Паста из 3 ст. л. меда и 1 ч. л. корицы. Смазывать прыщи перед сном и смывать следующим утром теплой водой. За 2 недели прыщи исчезнут полностью.

Укусы насекомых

Смесь 1 части меда на 2 части теплой воды с добавлением маленькой ч.л. корицы медленно втирать в зудящую часть тела. Замечено, что боль уменьшается через 1-2 минуты.

Несварение желудка

Пудра корицы, посыпанная на 2 ст.л. меда, принимаемая перед едой, снижает кислотность и помогает переваривать самую тяжелую пищу.

Язва желудка

Мед с корицей снимает боль в желудке, а также залечивает язвы.

Газы

Согласно исследованиям в Индии и Японии, выявлено, что мед с корицей уменьшает вздутие желудка.

Зубная боль

Смесь 1 ч.л. корицы и 5 ч.л. меда наложить на больной зуб. Можно делать 3 раза в день, пока боль не пройдет.

Запах изо рта

Жители Южной Америки первым делом с утра полощут горло горячим раствором меда с корицей, чтоб сохранить приятный запах во рту на целый день.

Потеря слуха

Ежедневно утром и вечером принимать мед и корицу в равных пропорциях.

Простуда

Страдающие от простуды должны принимать 1 ст.л. теплого меда с 1/4 ч.л. корицы 3 раза в день. Вылечивает почти любой хронический кашель, простуду и освобождает носовые проходы.

Грипп

Испанский ученый доказал, что мед содержит натуральный элемент, который убивает бактерии гриппа и спасает человека от заболевания.

Рак

Недавние исследования в Японии и Австралии выявили, что рак желудка и костей может быть успешно вылечен. Пациенты с такого рода опухолями должны принимать ежедневно 1 ст. л. меда с 1 ч. л. корицы в течение месяца 3 раза в день.

Лишний вес

В стакане теплой воды разводятся 1 чайная ложка меда и одна чайная ложка корицы. Выпивается утром натощак.

Ну и рецепт для долголетия

Чай с медом и корицей, принимаемый регулярно, задерживает наступление старости. 1 л. корицы, заваренная в 3 стаканах воды и охлажденная, 4 л. меда. Пить 1/4 чашки 3-4 раза в день.

bublik.delfi.ee

БЕЛОРУССКИЕ СТОМАТОЛОГИ ИСПОЛЬЗУЮТ В ЛЕЧЕНИИ СТВОЛОВЫЕ КЛЕТКИ



Белорусские стоматологи достигли успехов в лечении стволовыми клетками периодонтита — одного из наиболее часто встречающихся воспалительных заболеваний корня зуба или околокорневых тканей. Заболевание чревато потерей зубов. Об этом сообщил на пресс-конференции 6 февраля главный внештатный стоматолог Республики Беларусь, главный врач Республиканской клинической стоматологической поликлиники Андрей Матвеев, передает корреспондент агентства «Минск-Новости».

— Клеточные технологии в лечении периодонтита мы стали применять сравнительно недавно, — отметил А. Матвеев. — У 94 % пациентов, получивших лечение стволовыми клетками, положительный результат. Словом, оно помогло.

Методика исцеления от периодонтита стволовыми клетками — совместный проект врачей-стоматологов и ученых Института биофизики и клеточной инженерии Национальной академии наук Беларуси. Специалисты разработали технологию получения биотрансплантата из собственных клеток жировой ткани человека. Причем для пациента эта процедура абсолютно безопасна. Вкратце: сначала человек проходит обследование, потом у него «забирают» биоматериал, смешивают его с коллагеновым гелем. Затем полученную массу вводят область десны. В результате биотрансплантант трансформируется с костной тканью. Такое вот лечение, которое применяют в столичной Клинике эстетической стоматологии (бывшей 2-й стоматологической поликлинике). Теоретически лечить по новой методике можно в любой стоматологической поликлинике. Однако есть нюанс: стволовые клетки выращивают только в лаборатории Института биофизики и клеточной инженерии.

Методика лечения периодонтита стволовыми клетками противопоказана пациентам с заболеваниями щитовидной железы, злокачественными опухолями.

minsknews.by

Подготовила Анна ВОЛОДАЩУК
anna@gs.by

ШЛЯХ ДА БОГА

Язычніцкае свята захавалася ў праваслаўі


ФОТА З АРХІВА АЎТАРА

На Масленіцу

Святаў, якія аб'ядноўвалі б вернікаў і язычнікаў, няшмат. Але ёсць адмысловае, якое аб'ядноўвае абрадавер'е народнае і вернікаў — Масленіца.

Традыцыйна яна спраўляецца тыдзень, сёлета — з 24 лютага і да 1 сакавіка. У сутнасці, гэта развітанне з зімой і ўрачыстая сустрэча вясны.

Масленіца — свята паганскае. І першапачаткова яе здзяйсненне ў нашых продкаў было звязана, па адных версіях, з услаўленнем бога Сонца Ярылы, па іншых — «бога жывёл» Вялеса.

У старажытныя часы гэта свята было адным з тых, што дапамагала асэнсаваць плынь часу. Яно як ніякае іншае мае мноства прыкмет і рытуалаў. Гулянні заўсёды суправаджаліся агнём — падпаленыя вогнішчы, колы і пудзіла былі галоўнымі атрыбутамі Масленіцы і водгукамі культу сонца.

З прыняццем хрысціянства Царква прыняла гэтае паганскае свята, але напоўніла яго новымі ідэямі. Масленічны тыдзень стаў апошнім этапам падрыхтоўкі да Вялікага посту. У хрысціянскай традыцыі за сем дзён Масленіцы вернікі павінны прабачыць крыўды, павініцца ў правінах у споведзі, прымірыцца з блізкімі.

Масленічны тыдзень пачынаецца ў панядзелак і заканчваецца ў нядзелю спальваннем пудзіла. Кожны дзень гэтага тыдня ўнікальны і напоўнены глыбокім сэнсам. Кожны з дзён мае сваю назву і рытуалы, якія раней трэба было абавязкова выконваць.

У панядзелак адзначалі сустрэчу. У гэты дзень хадзілі па гасцях і выпякалі першы святочны блін. Яго аддавалі беднякам у памяць пра спачылых сваякоў. Аўторак — зайгрышы, гэта быў дзень сватаўства, калі хадзілі па вёсцы і рабілі агледзіны. У Вялікі пост вяселлі гуляць па царкоўным уставе забаронена, затое на Чырвонай горцы, па-іншаму Светлай сядміцы, яны былі нярэдкай з'явай.

> Масленіца — свята паганскае. І першапачаткова яе здзяйсненне ў нашых продкаў было звязана, па адных версіях, з услаўленнем бога Сонца Ярылы, па іншых — «бога жывёл» Вялеса.

А серада — ласуха. У гэты дзень цешча частавала зяця блінамі (адгэтуль выраз «да цешчы на бліны»). А ў пятніцу — цешчыны вячоркі — ужо яна са сваімі сяброўкамі наведвалася ў госці, каб пачаставацца блінамі зяця.

У чацвер Масленіца дасягала свайго апагею, з-за чаго і называлася шырокай. Моладзь вадзіла карагоды, каталася з горкі, скакала праз вогнішча, праводзіла кулачныя баі. Передапошні дзень называўся «залвіцыны вячоркі». Маладыя ятроўкі клікалі ў госці залвіц — сясцёр будучага мужа і праводзілі час разам. Цікава, ці не адгэтуль пайшлі цяпер модныя дзявочнікі напярэдадні вяселля, але, у сутнасці, вельмі падобна.

У нядзелю спраўлялі прабачэння ў блізкіх, паміналі нябожчыкаў. Як тут не ўспомніць ўрачысты чын прабачэння, які традыцыйна здзяйсняецца ў манастырах у нядзелю на вячэрняй службе, калі манахі адзін у аднаго просяць прабачэння, а архірэй, укленчыўшы, «прабачаецца» з усімі ў манастырскім храме. Пакінутую скаромную ежу народ спальваў, мыў посуд, а затым ішоў у лазню, каб не толькі духоўна, але і цялесна ачысціцца.

Урачыстае спальванне пудзіла Масленіцы завяршала святочны тыдзень. Попел развейвалі над палямі, каб будучы год быў ураджайным. Цікава, што раней Масленіцу святкавалі не тыдзень, а месяц і гулянні праходзілі з размахам.

Максім СУДЗІЛОЎСКІ

ЗВЕСТКІ З МАСТОЎШЧЫНЫ

ВАЎКАВЫСКІХ КІРАЎНІКОЎ У МАСТАХ БОЛЬШАЕ


ФОТА «ЗАРА НАД НЁМАНАМ»

Святлана Валяватая

Яшчэ адну кіруючую пасаду ў Мастоўскім райвыканкаме заняў прадстаўнік шэрагу ваўкавыскіх спецыялістаў.

На пасаду намесніка начальніка ўпраўлення працы, занятасці і сацыяльнай абароны — начальніка аддзела сацыяльнай абароны Мастоўскага райвыканкама прызначана Святлана Валяватая, жонка старшыні райвыканкама.

Папярэдне яна працавала вядучым спецыялістам ва ўпраўленні.

Язэп ПАЛУБЯТКА

Афиша

Слонимский драмтетар

Спектакль для дзяцей «Дзень нараджэння ката Леапольда». Пачатак у 12.00. Кошт 4 руб.

Спектакль для взрослых «Тустеп на фоне чемоданов». Начало в 17.00. Цена 6 руб.

Городской парк

29 февраля, суббота

Народное гулянье «Масленичные забавы», начало в 12.00

Слонимский центр культуры

Кинозал

26 февраля, среда

12.00, 14.00 «Соник в кино» 2D (США, 6+, семейный, 1.40)

16.00, 20.39 «Калашников» 2D (Россия, 12+, история, 1.50)

18.00 «Лёд 2» 2D (Россия, 6+, спорт, 2.10)

27 февраля, четверг

12.00, 14.00, 18.00 «Удивительное путешествие доктора Дулиттла» 3D (12+, семейный, 1.41)

16.00 «Калашников» 2D (Россия, 12+, история, 1.50)

20.00 «Лёд 2» 2D (Россия, 6+, спорт, 2.10)

28 февраля, пятница

12.00, 14.00, 20.30 «Удивительное путешествие доктора Дулиттла» 3D (12+, семейный, 1.41)

16.00 «Калашников» 2D (Россия, 12+, история, 1.50)

18.00 «Лёд 2» 2D (Россия, 6+, спорт, 2.10)

29 февраля, суббота

12.00, 14.00, 18.00 «Удивительное путешествие доктора Дулиттла» 3D (12+, семейный, 1.41)

16.00 «Калашников» 2D (Россия, 12+, история, 1.50)

20.00 «Лёд 2» 2D (Россия, 6+, спорт, 2.10)

1 марта, воскресенье

12.00, 14.00, 20.30 «Удивительное путешествие доктора Дулиттла» 3D (12+, семейный, 1.41)

16.00 «Калашников» 2D (Россия, 12+, история, 1.50)

18.00 «Лёд 2» 2D (Россия, 6+, спорт, 2.10)

Мацярынскі капітал



МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

Старая Кацярына Субоцік сядзела ля акна і пазірала, як жыхары іхняга аграгарадка Мікуці ішлі з работы, і па-добраму зайздросціла ім:

— Няўжо гэта і я некалі мела лёгкія ногі, добры зрок, бегала на работу на калгасную ферму? Ды столькі гадочкаў... І радасна было, і жыць хацелася, а цяпер сяджу вось як жук пад карою ды чакаю, пакуль сацыяльная работніца Міра прынясе лекі ды ежу. Ці часам суседка загляне...

Яна хварэла. Ды і хто пасля васьмідзесяці не хварэе? Можа і ёсць шчаслівыя, але Кацярына не з такіх. Надта мучыць боль у нагах, ледзь сноўдаецца на падлакотных кастылях. І адна ў хаце, хоць воўкам вый. Яе Міхась памёр больш як дваццаць гадоў таму назад, а сын Васіль жыў у мястэчку Карпуці, што за дзевяць кіламетраў ад іхніх Мікуцёў. Нібыта і недалёка, але дарогу да мацеры ён даўно забыўся. Добра, калі раз у год наведаецца. І машыну мае, і не калека, ды навошта яму старая ды хворая, якая з яе карысць?

За акном яшчэ было светла, бо дзень у лютым пабольшаў. Кацярына гэтаму была вельмі рада, бо вясной, што ўжо не за гарамі, яна зможа выйсці на двор, пасядзець на лаўцы пры плоце.

Нечакана ўбачыла, што па вуліцы павольі едзе прыгожы легкавік, акурат як сынаў. Машына была цёмнага колеру, блішчала фарбай у промнях сонца, што апускалася за гарызонт.

Гэта і сапраўды быў Васіль. Ён спыніў машыну ля варот і пайшоў на надворак. Мацярынскае сэрца закалацілася злоўленай птушкай:

— Прыехаў-такі сынок! Родная кроў цягне, — радавалася, і на вачах выступілі слёзы.

Васіль быў з пустымі рукамі, але хіба гэта так важна? Галоўнае, што прыехаў, парадаваў, а што не прывёз мацеры ніякага пачастунку, то хіба хоць адна маці зважае на гэта? Галоўнае, што жывы-здаровы. Лічы, цалюткі год яна не бачыла свайго Васілька — дужага дзябёлага мужчыну, якому ўжо пераваліла за шэсцьдзясят. Не бачыла і не чула.

Некалі прасіла:

— Васілька, давай правядзём мне тэлефон... У вёсцы ж амаль ва ўсіх ёсць...

— Навошта?

— Пазваню табе, ці ты калі пазвоніш...

— Так і думаў! Будзеш дурыць галаву сваімі званкамі ды ныць, скардзіцца на балячкі. То прыедзь да цябе памажы... У суседзяў ёсць тэлефоны...

— Дык я ж не дайду. Асабліва зімой...

— А не дойдзеш, то і сядзі. Сацыяльная работніца штo трэба прынясе. На ўсім жа гатовым, як пані.

Яна больш не прасіла ў яго ні тэлефона і нічога. Ведала, што цяпер у людзей ёсць і мабільнікі. Яе суседкі таксама маюць, дзеці з гарадоў папрывозілі. Кажуць, вельмі зручна. Яна таксама хацела, ды баялася нават заікацца пра гэта, бо ведала, што Васіль усё роўна не купіць. Ды яшчэ і насварыцца.

Ён зайшоў у хату. Высокі, чырванашчокі. У прыгожай карычневай дублёнцы.

Кацярына памкнулася ўстаць, каб абняць сына, але ён апярэдзіў яе памкненні:

— Сядзі, старая, як сядзела, а то яшчэ ўпадзеш. Валэндайся пасля з табой.

Пільным вокам агледзеў хату:

— Хораша ў цябе, чыста.

— Дык гэта ж усё сацыяльная работніца Міра, ды і суседкі дапамагаюць...

Хацела сказаць, што цябе, тваёй жонкі ды дачкі і повідам не відаць, ды своечасова спахапілася: яшчэ пакрыўдзіцца і наогул ніколі не прыедзе.

— Як жа ты, Васілёк? — спытала, з мацярынскай адданасцю заглядаючы ў вочы. — Добра, нібыта...

— Добра, а будзе яшчэ лепш. Скажы, старая, ці шмат грошай назбірала? Пакажы свой, так бы мовіць, мацярынскі капітал.

— Пра грошы пытаеш... Дык я ж усе, што зарабляла, табе на дом аддала, як будаваўся. А цяпер з пенсіі крыху адкладваю...

— Навошта? Ты мне скажы, навошта старой грошы?

— На пражыццё, на лекі, на ўсё-ўсякае. Астатняе адкладваю.

— Ну вось і аддай тое, што надкладвала. Хачу машыну памяняць гэту на новую.

— А мне на смерць што ж будзе? Таксама грошы патрэбны.

— Дзяржава дасць. За тыя грошы можна пахаваць чалавека. Не абавязкова баль устройваць, склікаць вялікае застолле.

— Не баль, а каб усё па-людску...

— Ну гэта ты ўжо вырашаць не будзеш, а я буду. Так што кажы, дзе грошы ляжаць, а то ўсё роўна ж знайду. Тады забяру ўсе, а так, можа, крыху пакіну.

— Бяры, сынок, калі ты такі бедны... — Кацярына, абапіраючыся на кастылі, пашаркала да стала, адчыніла шуфляду. Глыбока засунуўшы руку, выцягнула белую насовачку з зялёненькай аблямоўкай, у якую былі закручаны купюры, паклала на стол.

— Тут усё, — сказала, а ў голасе дрыжалі слёзы. Яна ж ніколі не купіла сабе ніякіх заморскіх фруктаў, хоць і вельмі хацела. Суседкі казалі, што вельмі смачныя і бананы, і апельсіны, і нейкае ківі, а яна не пакаштавала ніколі. Усё для яго грошы збірала. То вучыла, то жаніла два разы, і ўсё з вяселлем, то хату дапамагала будаваць, унучку вучыць... А пра сябе забылася...

Васіль сеў за стол, развязаў насовачку. Акуратна складваючы, пералічыў купюры.

— Мала тут... Але хоць нешта.

Дзве купюры паклаў назад у насовачку, закруціў.

— Назбіраеш яшчэ, — сказаў старой мацеры, якая ўжо не магла стрымаць слёз. — Будзе табе стымул жыць.

— Мо паеў бы што? Капуста вараная ў печы ёсць...

— Не хачу, ды і часу няма. Бывай!

Ён устаў і пайшоў за парог. Сеў у машыну, якая ўжо была не даспадобы і патрэбна была другая. Доўга разварочваўся на вузкаватай вуліцы. Неўзабаве за ёй растаў лёгкі сінюваты дымок, як растаў без знаку небагаты мацярынскі капітал...

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Главный редактор Николай Николаевич Кононович

Учредитель **Виктор Владимирович ВОЛОДАЩУК**

ГАЗЕТА ВЫХОДИТ НА РУССКОМ И БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКАХ

Телефоны редакции: Velcom: 8-029-133-04-21 **факс:** 8 (01562) 2-90-00 звонить с 9.00 до **18.00** **Skype — gazslon**

Для корреспонденции: 231799, г. Слоним, ул. Красноармейская, д.41 Юридический адрес: г. Слоним, ул. Красноармейская, 41

Регистрационное удостоверение №65 от 05.03.2009 года выдано Министерством информации Республики Беларусь. Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.

Авторы опубликованных материалов отвечают лично за подбор и достоверность фактов, их точка зрения может не совпадать с мнением редакции. Редакция не ведет переписки с читателями и оставляет за собой право не рецензировать и не возвращать рукописи. Редакция не несёт ответственности за содержание рекламы.

Свободная цена

Тираж номера 3010 экз.

Время подписания к печати по графику 25 февраля 2020 года 17:00

РЕКЛАМНАЯ СЛУЖБА 8(044) 715-90-03 8(044) 762-48-39; 8(044) 715-90-03 ул. Красноармейская, 41 **e-mail:** gs@gs.by, gazslon@gmail.com

Объем — два условных печатных листа. Газета отпечатана в ГОУПП "Гродненская типография", Гродно, ул. Полиграфистов, 4. индекс 230025 ЛП №02330/39 от 27.03.2014 Заказ № 907

Распространяется с газетой "Газета Слонимская" по подписке и в розницу по Республике Беларусь

ISSN 1991-3362



